ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
23
ЛІСТАПАДА
№ 31(1624)

ЗНАЁМЦЕСЯ: НАТАЛЛЯ БАНДАРОВІЧ

У жыцці кожнага чалавека абавязкова надыходзіць той момант, калі паўстае пытанне аб выбары будучай прафесіі. Настаў ён і ў Наталлі Бандаровіч. Дзяўчына доўга не вагалася і вырашыла стаць хімікам. І вось ужо тры гады яна з дня ў дзень набліжае той час, калі зможа, нарэшце, зрабіць першы самастойны крок у прафесію.

Будучы студэнткай БДУ, Н. Бандаровіч не толькі спасцігае азы складанай працы па спецыяльнасці. Яна вядзе вялікую грамадскую работу — сёлета таварышы абралі дзяўчыну старшынёй камісіі па культурна-выхаваўчай рабоце, якая дзейнічае пры прафсаюзным бюро факультэта.

Фота А. МАЖАРА.

Мы звяртаемся да тых студэнтаў, якія былі накіраваны на вучобу згодна Пастанове Савета Міністраў СССР ад 18 верасня 1959 года № 1099, а таксама тых, хто заключыў з НВА «Інтэграл» індывідуальныя дагаворы на 1989 год.

Справа ў тым, што Пастановы 1959 года больш не існуе, яна адменена. Таму з 1 кастрычніка 1989 года ўсім студэнтам, якія атрымлівалі стыпендыю за кошт сродкаў «Інтэграла», яна больш не выплочваецца. Каб зноў атрымліваць яе, гэтыя студэнты павінны прыйсці ў аддзел кадраў нашага прадпрыемства і заключыць індывідуальны дагавор на мэтавую падрыхтоўку на астатні тэрмін навучання. Раім ім добра вывучыць умовы дагавору. І перш за ўсё звярнуць увагу на тое, што цяпер наша аб'яднанне згодна выплочваць стыпендыі толькі за сапраўдныя веды, ураўнілаўкі, як раней, не будзе. А калі нехта адчуе, што ў яго не хопіць сіл і жадання для набыцця ведаў па дагавору, ён можа не заключаць яго, а стаць на ўлік у дэканаце на атрыманне стыпендыі з дзяржбюджэту.

Тым студэнтам, якія афармлялі індывідуальныя дагаворы вясной, летам і восенню 1989 года, мы зноў напамінаем, што аб'яднанне будзе пералічваць ім стыпендыі на асабовыя рахункі ў банкаўскіх аддзяленнях. Для гэтага неабходна завесці ў банку па месцы жыхарства ашчадную кніжку, па тэлефоне 77-39-30 паведаміць наступныя звесткі пра сябе: назва ВНУ, прозвішча, імя, імя па бацьку, нумар вашай ашчаднай кніжкі і банка, дзе яна заведзена. Яшчэ патрэбна атрымаць у дэканаце і перадаць у аддзел тэхнічнага навучання аб'яднання даведку аб паспяховасці, у якой будзе названы памер стыпендыі студэнта на будучы семестр. Каб атрымаць у дэканаце даведку, вы павінны прад'явіць свой экземпляр дагавору.

І, нарэшце, просьба да работнікаў дэканатаў. У даведках аб паспяховасці, якія выдаюцца студэнтам, не трэба пералічваць розныя працэнтныя надбаўкі. Дастаткова назваць экзаменацыйныя адзнакі і агульны памер стыпендыі.

Чакайце і дадатковай інфармацыі па гэтых пытаннях. Яна будзе накіравана непасрэдна ў дэканаты.

Б. МІХАЙЛЮК,
начальнік аддзела тэхнічнага навучання НВА «Інтэграл».

АНОНС

У наступным нумары чытайце

— Навошта гэтыя прафсаюзы? — усе часцей і часцей чуліся абураныя галасы.

— Распусціць іх даўно трэба,— падтаквалі ім другія.

— Ніякай карысці ад іх, толькі ўзносы плаці,— стараліся ўпэўніць у гэтым сябе і іншых трэція.

Але давайце будзем прынцыповымі і прызнаем, што амаль так яно і было. Ды падзьмуў цёплы вецер перамен, якія не абмінулі і прафсаюзы. І лозунг «Усё для дабрабыту чалавека!» зноў становіцца ў пашане.

Аб дасягненнях прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў і студэнцкага прафкома;

аб самых вострых і надзённых пытаннях, якія хвалююць сёння кожнага з нас;

аб планах і задачах на будучае вы даведаецеся, калі пазнаеміцеся з падборкай матэрыялаў на гэту тэму, якая будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

ТЭЛЕТАЙП

ПОСПЕХІ І НЕДАХОПЫ

заўсёды, напэўна, існуюць побач. У любой справе. Так і ў выхаванні і навучанні замежных студэнтаў. Дасягнута многае, але шмат што патрабуе ўдасканалення, новага падыходу. Напрыклад, павысілася патрабавальнасць да навучэнцаў з боку выкладчыкаў — упала паспяховасць. У чым справа? Ці толькі ў тым, што выкладчыкі сталі больш прынцыповымі?

Безумоўна, не. Па-ранейшаму не хапае падручнікаў, дапаможнікаў і метадычных распрацовак. Марудна ідзе работа па далейшаму ўдасканаленню методыкі чытання лекцый, правядзення семінарскіх і практычных заняткаў, кансультацый, залікаў і экзаменаў у замежных навучэнцаў. Ажыццяўляючы ўсё гэта, добра было б улічваць спецыфіку іх будучай працы і грамадска-палітычнай дзейнасці.

І яшчэ адна акалічнасць. Пэўную ролю ў павышэнні паспяховасці і паляпшэнні ідэйна-выхаваўчай работы павінны адыграць савецкія студэнты, тыя, хто жыве ў так званых інтэрнацыянальных інтэрнатах.

Аб усім гэтым ішла размова на нядаўнім пасяджэнні вучонага савета універсітэта.

З. МІХНЕВІЧ.

ВЫ ВЫЙГРАЕЦЕ ЎДВАЙНЕ

(ёсць магчымасць пераканацца ў гэтым), набыўшы дапаможнікі па розных дысцыплінах, выданыя выкладчыкамі і супрацоўнікамі універсітэта. Па-першае, вам не трэба будзе шукаць іх у чытальнай зале, па-другое, пры адказе на заліку ці экзамене вас не абвінавацяць у тым, што карысталіся састарэлым матэрыялам. Таму прапануем вам наведаць кніжны кіёск галоўнага корпуса і купіць неабходныя выданні: Богданов Ю. С., Кастрица О. А. Начала анализа в задачах и упражнениях; Борисоглебский Л. А. Квантовая механика; Бурак Л. И., Красней В. П., Лазовский В. М. Современный белорусский язык; Морозов Е. И., Тарасевич Е. И., Анохина В. С. Генетика в вопросах и ответах; Чертко Н. К. Математические методы в физической географии.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

ПЕРШЫНСТВО БДУ

па настольнаму тэнісу вызначыла пераможцаў. Імі сталі зборныя філалагічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў і ФПМ, якія занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы.

Т. ДОЎНАР.

ТЭРМІНОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

Пастанова адменена

ДА 500-ГОДДЗЯ Ф. СКАРЫНЫ

НАСУСТРАЧ СОНЦУ

«Блажен муж иже не иде на совет нечестивых»,— гэтымі словамі пачынаўся «Псалтыр» Скарыны, першая друкаваная кніга на Беларусі, якая выйшла ў сталіцы Чэхіі Празе ў 1517 годзе. Паміж 1517 і 1486 — годам сонечнага зацьмення і магчымага нараджэння вялікага беларускага асветніка — невялікая часовая працягласць. Але колькі значылі гэтыя гады для Беларусі! Крокі з беспрасветнай цемры насустрач асвеце і цывілізацыі.

Існуе меркаванне, што той 1486 год зацьмення і даў падставу Скарыне выбраць для сябе характэрны выдавецкі знак: сонечны дыск з напаўзаючым на яго паўмесяцам. Але ўсё ж у навуковых колах прынята лічыць год 1490 годам нараджэння Францыска Скарыны.

Таму ў адпаведнасці з рашэннем ЮНЕСКО ў 1990 годзе шырока будзе адзначацца 500-годдзе з дня нараджэння першага беларускага друкара, хоць дакладнай даты яго з'яўлення на свет мы не ведаем.

«Я, Францишек Скоринин сын с Полацка, в лекарских науках доктор, повелел есми Псалтырю тиснути русскими словами, а словенским языком... наболей с тое причины, иже мя милостивый бог с того языка на свет пустил». Тут, у сваім першым друкаваным творы недвухсэнсоўна гаворыцца аб тым, якую мову асветнік лічыў роднаю. «Рускай» у той час называлася дзяржаўная мова Вялікага княства Літоўскага, на якой гаварылі і пісалі беларусы і ўкраінцы.

Так пачыналася выдавецкая праца Францыска Скарыны. Потым за два гады друкарскай дзейнасці ў Празе, акрамя «Псалтыра», Скарына выпусціў яшчэ 19 старадаўніх кніг «Бібліі», ім «на русский язык ново выложенных».

У многім вульгарная атэістычная крытыка апошніх дзесяцігоддзяў выпрацавала ў нас погляд на «Біблію» як на кнігу ад першага да апошняга слова рэлігійную, а значыць супрацьстаячую навуковаму светапогляду. Між тым, «Біблія» — адзін з найвялікшых твораў сусветнай літаратуры. «В сей книзе,— пісаў Францыск Скарына,— всее прироженное мудрости и конец... В сей книзе вси законы и права, ими же люди на земле справоватися имають, написаны суть. В сей книзе вси лекарства, душевные и телесные, зуполне знайдете».

Францыск Скарына прызначаў свае выданні свецкаму чытачу, указваў, што «не толико докторове, а люди вченые в них разуметь, но всякий человек простый и посполитый, чтут их ими слухаичи, может поразумети».

Ён шмат пабачыў і пачуў, таксама і даведаўся на сваім сапраўды нялёгкім жыццёвым шляху, але, мусіць, больш за гэта стараўся, каб нешта ўбачылі і пачулі іншыя. І сонечны дыск быў для яго не проста выдавецкім знакам. «Біблію» Скарына лічыў тым святлом, якога так не хапала яго суайчыннікам.

...Прадмовы, напісаныя Францыскам Скарынам для асобных выданняў, дазваляюць нам меркаваць аб яго светапоглядзе, аб яго філасофскіх, этычных і эстэтычных поглядах.

Гэта быў патрыёт сваёй айчыны, роднай мовы, таму і праславіў ён біблейскую гераіню Юдзіф, якая выратавала свой народ, пазбавіўшы галавы Алаферна, правадыра войскаў чужаземных захопнікаў. У прадмове да «Кнігі Юдзіф» Скарына пісаў: «Понеже от прироженя звери, ходящие в пустыне, знают ямы своя; птицы, летающие по воздуху, ведают гнезда своя; рыбы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобноя боронять ульев своих — тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть... к тому месту великую ласку имеють».

Да сваёй радзімы — Беларусі, да свайго народа, які ён называў «братия моя Русь», Скарына заўсёды ставіўся з «великой лаской».

Падрыхтаваў А. АСТАПАЎ.

ХТО ШУКАЕ ДАРОГУ ДА СЭРЦА

ЧЫТАЧ, глядач, слухач, успрымаючы штодзень велізарную колькасць інфармацыі, карыстаецца вынікамі працы журналістаў. Зносіны з прадстаўнікамі гэтай прафесіі павялічваюцца, калі мы больш звяртаемся да розных перыядычных выданняў, тэлевізійных каналаў і перадач радыё. Зараз грамадства дасягнула такога ўзроўню развіцця сродкаў масавай інфармацыі, што яны напаўняюць жыццё чалавека, аказваюць на яго моцнае ўздзеянне, а журналіст у гэтай сістэме часта становіцца першым, а то і адзіным

субяседнікам і дарадчыкам. Калі ўлічыць, што такія адносіны паміж асобай і журналістам фактычна на ўсё жыццё, то становіцца зразумелай асаблівая грамадская важнасць масавай творчай прафесіі.

Сацыяльная каштоўнасць журналісцкай працы яшчэ больш узвысілася ў цяперашні рэвалюцыйны час. Журналістыка аказалася на вастрыі дэмакратыі, ажыццяўлення галоснасці і тых палітычных і эканамічных пераўтварэнняў, якія адбываюцца ў нашай краіне і рэспубліцы.

Зразумела, паўната і шматграннасць жыцця, глыбіня распрацоўкі тэарэтычных і вырашэння практычных праблем абнаўлення сацыялізму залежаць у многім ад узроўню падрыхтаванасці журналіста да публіцыстычнай творчасці, азы якой спасцігаюцца на факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна.

АДЗІНАЙ у рэспубліцы ўстанове, дзе рыхтуюцца кадры журналістаў, споўнілася 45 гадоў. Факультэт журналістыкі быў адкрыты ў 1944 годзе па рашэнню ЦК ВКП(б). Адбылося гэта дзякуючы вызваленню Беларусі ад фашысцкай акупацыі, калі народ пачаў аднаўленне мірнага жыцця, эканомікі і культуры, разбураных доўгай вайной. Патрэбна было і праўдзівае слова — слова радасці вызвалення, надзеі на будучае.

Зараз ужо можна падвесці вынікі работы факультэта, пакаленняў выкладчыкаў і студэнтаў. Вынікі гэтыя важкія. Сродкі масавай інфармацыі рэспублікі забяспечаны высокакваліфікаванымі кадрамі. Рэдактары рэспубліканскіх газет і часопісаў, Дзяржтэлерадыё Уладзімір Вялічка, Зіновій Прыгодзіч, Уладзімір Наркевіч, Аляксандр Класкоўскі, Уладзімір Бельскі, Васіль Драгавец, Ніна Чайка, Таццяна Харавец, Жанна Літвінава; публіцысты, лаўрэаты прэміі Саюза журналістаў СССР Віктар Захарчук, Рыгор Кадзет, Іосіф Сярэдвіч; сабкоры цэнтральных выданняў Аляксандр Уліцёнак, Віктар Леганькоў, Анатоль Казловіч, Вольга Ягорава, Мікалай Матукоўскі, Аляксей Жук; многія пісьменнікі рэспублікі — лепшыя выпускнікі факультэта розных гадоў. Гэта той высокі ўзровень таленавітасці беларускай публіцыстыкі, які не толькі вызначае дзейнасць друку, радыё і тэлебачання рэспублікі, але і ўздзейнічае на развіццё грамадскай свядомасці, агульнай культуры беларускага народа.

Аднак ёсць яшчэ больш значнае дасягненне факультэта: больш чым палова раённых газет забяспечаны дыпламаванымі спецыялістамі. Наша рэспубліка займае першае месца ў краіне па гэтай каштоўнай у ідэалагічных адносінах шкале.

І хоць сутнасць не ў лічбах, аднак кваліфікавана «пісаць гісторыю сучаснасці» могуць толькі прафесіяналы. Таму абсалютна заканамерна павышэнне ўзроўню раённага друку ў апошняе дзесяцігоддзе і асабліва ў цяперашні, перабудовачны час. Журналісты-раёншчыкі ў асноўным былі гатовы да ўспрыняцця працэсаў абнаўлення. Яны чакалі моманту, каб скінуць шоры бюракратычнага кіравання творчасцю, вярнуць прэсе ленінскія прынцыпы свабоды, а сабе — права змагацца за сапраўдныя інтарэсы народа. Вось найбольш яркія і цікавыя выданні: газеты «Знамя коммунизма» (Баранавічы), «Камуніст» (Бабруйск), «Запаветы Леніна» (Асіповічы), «Уперад» (Ліда).

Калі чытаеш іх, становіцца зразумелым, што рэдакцыйны калектыў — гэта і інфарматар, і ілюстратар, але ў той жа час і аналітык, а па вялікаму рахунку — і генератар ідэй.

Журналісты-раёншчыкі не адасабляюць сябе ад тых клопатаў, якімі жывуць людзі, дакладней, знаходзяцца ў гушчыні жыцця. Яны «падпітваюць» беларускую журналістыку самым важным матэрыялам аб тым, як жыве і працуе, радуецца і пераносіць цяжкасці працоўны чалавек.

ЗРАЗУМЕЛА, каб падрыхтаваць кадры для сродкаў масавай інфармацыі, неабходна была і дасканалая сістэма навучання журналістаў, якая паступова фарміравалася на факультэце. Назапашваўся ўласны вопыт, выкарыстоўваліся дасягненні іншых універсітэтаў. Сфарміраваўся прафесарска-выкладчыцкі састаў, здольны на самым высокім узроўні забяспечыць вучэбны працэс.

У гэтым ганаровым спісе — прафесар Р. В. Булацкі. Яго імя фактычна неаддзельна ад самой гісторыі беларускай журналістыкі. Няма таго газетчыка ў рэспубліцы, які не прайшоў бы школу Булацкага. І, напэўна, няма вышэйшай узнагароды, чым папаўненне радоў вучняў, сярод якіх не толькі студэнты, але і кандыдаты і дактары навук.

Лёс пасляваеннай беларускай журналістыкі — гэта жыццё прафесара Б. В. Стральцова, імя якога аўтарытэтна заняло сваё месца ў сэрцах студэнтаў і чытачоў. Пісьменнік, публіцыст, вучоны, які шмат зрабіў для распрацоўкі тэарэтычных праблем журналістыкі, натхняючы



сваім прыкладам студэнтаў і выкладчыкаў да пастаяннай творчасці.

Неабыякавыя ўражанні ў памяці выпускнікоў пакідае прафесар М. Я. Цікоцкі. Яго інтэлігентнасць, чуласць, кампетэнтнасць з'яўляюцца адной з галоўных жыццёвых вучэбных дысцыплін для ўсіх, хто ведае яго.

Няма сумненняў — часцінка жыцця кожнага выкладчыка факультэта, прафесараў Е. Л. Бондаравай, А. І. Наркевіча ўлілася ў журналісцкі лёс большасці выпускнікоў.

Рады іх памнажаюцца. Ужо не менш пяці тысяч журналістаў — выпускнікоў факультэта — працуюць у сродках масавай інфармацыі, у тым ліку каля двухсот замежных грамадзян з розных краін свету атрымалі творчы дыплом у сценах Беларускага універсітэта. Сярод нядаўніх выпускнікоў шмат журналістаў, якія ўжо выпрацавалі свой стыль, свой метад зносін з аўдыторыяй. Да такіх адносяцца Аляксандр Прастата, Андрэй Шлег, Таццяна Канапацкая, Наталля Жаркевіч, Алена Масла, Андрэй Патрэбін.

Думаю, гэта новае пакаленне беларускіх журналістаў, якім выводзіць рэспубліканскія сродкі масавай інфармацыі на парог новага тысячагоддзя.

ГЭТАЙ задачы падпарадкавана работа факультэта сёння. А калектыў хвалюе працэс перамен і набліжэнне перспектыў. Уведзены новы вучэбны план, у якім выкраслена архаіка і студэнтам дадзена магчымасць працаваць самастойна. Зараз ідзе адпрацоўка новага, сучаснага вучэбнага плана, нацыянальнага па форме і зместу. Яго галоўная ідэя ў тым, каб рыхтаваць беларускія кадры журналістаў, якія адпавядалі б спецыфіцы палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця рэспублікі.

Адбываецца арганізацыйная рэканструкцыя. На завочным факультэце створана група трохгадовага навучання для тых, хто мае вышэйшую нежурналісцкую адукацыю і працуе ў рэдакцыях, адкрыты філіялы выпускаючых кафедраў пры газеце «Звязда» і на Дзяржтэлерадыё, працуе НДЛ сучасных сродкаў інфармацыі, пачаўся працэс абнаўлення выкладчыцкіх кадраў.

Ствараюцца ўмовы, каб студэнты жылі ў творчай атмасферы, каб усё было падпарадкавана фарміраванню асобы будучага журналіста, напоўненай сапраўднымі маральнымі каштоўнасцямі.

Праграма, безумоўна, правільная, вывераная часам, заснаваная на багатым гістарычным вопыце; перспектыўная, таму што супадае з развіццём ідэалагічных працэсаў у нашай краіне; сучасная і сацыяльна важная ў сувязі з неабходнасцю фарміравання новага мыслення. Але выканаць яе нялёгка, таму што факультэт працуе ў складаных умовах. Ён адзіны сярод факультэтаў журналістыкі краіны, а таксама сярод усіх ВНУ рэспублікі не мае сваёй рабочай плошчы і туліцца ў прыстасаваных памяшканнях у двух месцах горада.

Міжнародны факультэт па кантынгенту студэнтаў (вучыцца больш за 200 замежных грамадзян з 48 краін свету) не мае сучасных тэхнічных сродкаў навучання будучых журналістаў. Няма патрэбы гаварыць, як гэта абядняе вучэбна-выхаваўчы працэс і якія цяжкасці стварае для работы выкладчыкаў.

Выклікае трывогу, што ідэалагічная навучальная ўстанова рэспублікі, якой з'яўляецца факультэт журналістыкі, знаходзіцца ў бядняцкім стане ўжо другое дзесяцігоддзе. Яшчэ больш хвалюе тое, што і ў бліжэйшыя дзесяць гадоў ніякіх перамен не прадбачыцца. Яны могуць адбыцца толькі тады, калі будзе пабудаваны новы універсітэт. Такая хісткая і бясконца далёкая перспектыва ў літаральным сэнсе дэмаралізуе выкладчыкаў і студэнтаў, прымушае трымацца думкі, што дырэктыўныя органы горада і рэспублікі, тыя магутныя арганізацыі, куды ідуць нашы выпускнікі, не могуць і не жадаюць дапамагчы факультэту.

Без спасылкі на цяжкае становішча, у якім знаходзіцца наша краіна, неабходна зразумець: чым больш адкладваецца вырашэнне праблем журфака, тым больш журналісцкі корпус страчвае ўпэўненасць у поспехах працэсаў абнаўлення ў рэспубліцы і давер да тых, хто арганізуе і накіроўвае гэтыя працэсы.

У жорсткіх умовах можна выхаваць у лепшым выпадку аскета, а нам патрэбна сфарміраваць характар эмацыянальны, душу высакародную і сэрца трапяткое і чулае, розум дапытлівы — журналіста таленавітага, жадаючага працаваць на карысць радзіме, здольнага данесці да сэрца чалавека вобразнае слова.

І ЎСЁ ж калектыў факультэта спадзяецца на лепшыя адносіны да сябе, заслужаныя саракапяцігадовай працай, і на хуткія змены ў набыцці ўласнага дома, а зараз працягвае працаваць у авангардзе рэвалюцыйнай перабудовы.

А. СЛУКА,
дэкан факультэта
журналістыкі, прафесар.

НА ЗДЫМКАХ: Былы дэкан факультэта журналістыкі, доктар гістарычных навук, прафесар Рыгор Васільевіч Булацкі; у чытальнай зале — замежныя навучэнцы; над чарговай вучэбнай перадачай у радыёстудыі працуюць студэнты II курса; выдатніца вучобы чацвёртакурсніца Галіна Прыгара.

Фота С. ГРЫЦА.





МЫ АБУДЗІЛІСЯ РАЗАМ З ІНШЫМІ, МАГУТНЫ ЗВОН ПЕРАБУДОВЫ ВЫЗВАЛІЎ НАС АД ЛЕТУРГІЧНАГА, СТРАШНАГА СНУ. МЫ СХАМЯНУЛІСЯ І УСКРЫКНУЛІ, ЯК І УСЕ НАРОДЫ НАШАЙ КРАІНЫ, ТОЛЬКІ... НА ЧУЖОЙ МОВЕ. СВАЮ ЗАБЫЛІСЯ. ЯЕ ТРЭБА УСПОМНІЦЬ, ВЯРНУЦЬ САМОМУ САБЕ, ЗАГАВАРЫЦЬ, ЗАСПЯВАЦЬ НА ЁЙ. КРЫКНУЦЬ НА ЎВЕСЬ ГОЛАС: «Я — БЕЛАРУС!». І ТАК БУДЗЕ.

А ПАКУЛЬ МЫ — СТАРАЖЫТНЫ, СЛАЎНЫ І МУЖНЫ НАРОД — ВЫМУШАНЫ ПАЧЫНАЦЬ ВУЧЫЦЦА ГАВАРЫЦЬ НА СВАЁЙ ЖА МОВЕ, ЯК НЕМАЎЛЯТЫ. ПАСТУПОВА, НЕ ЗУСІМ ЯШЧЭ ПРАВІЛЬНА, ЧАСАМ НАВАТ ПА СКЛАДАХ. ПАТРЭБНЫ НАСТАЎНІК — РАЗУМНЫ І СПАГАДЛІВЫ, ДОБРЫ І СПАКОЙНЫ, ПАТРЭБНЫ ПАДРУЧНІК — ПРОСТЫ І ЗРАЗУМЕЛЫ. І Ў СВАЮ ЧАРГУ НЕАБХОДНЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ БЕЛАРУСКАМОЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ. ЁН ЗНОЎ НАРАДЖАЕЦЦА, ЁН СЁННЯ ВУЧЫЦЦА РАЗМАЎЛЯЦЬ НА РОДНАЙ МОВЕ, КАБ СТАЦЬ САПРАЎДЫ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭТАМ. ЁН АБУДЖАЕЦЦА РАЗАМ СА СВАІМ НАРОДАМ.

ДЫСКУСІЯ НА ТЭМУ: «БЕЛАРУСКАЯ МОВА ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ: ПАШЫРЭННЕ СФЕРЫ ЎЖЫТКУ» САБРАЛА Ў 206-М ПАКОІ ГАЛОЎНАГА КОРПУСА НЕ ТОЛЬКІ, ЯК ЗВЫЧАЙНА, КАМПЕТЭНТНЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ, ПРАДСТАЎНІКОЎ РЭКТАРАТА. ТУТ БЫЛО ШМАТ СТУДЭНТАЎ, І НЕ ТОЛЬКІ ЦІКАЎНЫХ, АЛЕ І ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ. ЗРЭШТЫ, УСЁ РОЎНА ГАВАРЫЛІ НАЙБОЛЬШ ВЫКЛАДЧЫКІ.

Без дзяцення на адзяленні

Гісторыя дае нам шанц

У. А. НАВУМОВІЧ, загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для нефілалагічных факультэтаў.

Жаданне выказаць свае адносіны да такога набалелага пытання, як лёс роднай мовы, у людзей зараз вялікае. Аднак, мне думаецца, даўно прыйшоў час спраў. Як іх рабіць? Падумаем разам. Абапіраючыся на той невялікі вопыт, які мы зараз маем па беларусізацыі універсітэта. На гэтым «участку» ніхто больш за нас, навукоўцаў, інтэлігенцыі, не зробіць. Гісторыя дае нам шанц, шанц на адраджэнне. Яго мы не павінны губляць. Нашчадкі нам не даруюць, калі мы не здолеем вярнуць і захаваць свой найвялікшы скарб — родную мову. Неабходна сканцэнтраваць, засяродзіць усе свае сілы. І галоўнае сёння не тое, дзе мы знаходзімся, а ў якім кірунку рухаемся па шляху аднаўлення матчынай мовы. Дарэчы, ці рухаемся? Давайце рухацца!

Рада прапануе банк ідэй

А. А. ЛОЙКА, старшыня рады ТБМ універсітэта, член-карэспандэнт АН БССР, загадчык кафедры беларускай літаратуры.

У першую чаргу трэба паставіць пытанне перад вучоным саветам універсітэта аб уключэнні ў правілы прыёму абавязковага ўступнага экзамену па беларускай мове і літаратуры на ўсіх, без выключэння, факультэтах. Гэтым усяго толькі выканаем загад Міністэрства народнай адукацыі БССР. Пажадана, каб экзамен праводзіўся ў вуснай форме замест сачынення. Ён будзе менш палохаць абітурыентаў і стане найвялікшым рычагом у падважванні беларускай мовы ў школе. Вучні пачнуць загадзя рыхтавацца да вуснага экзамену і міжволі больш увагі будуць надаваць практыцы вымаўлення, фактычна — ужывання роднай мовы як сродку зносін.

Безумоўна, школа чакае беларускамоўных настаўнікаў. Мы ж дакладна не ведаем, колькі іх патрэбна. Таму савету універсітэта пажадана папрасіць Міністэрства народнай адукацыі рэспублікі давесці БДУ план падрыхтоўкі спецыялістаў усіх профіляў для беларускамоўных школ. А ўжо ў адпаведнасці з планам пачаць навучанне студэнтаў па дзвюх плынях: беларускай і рускай.

Студэнты беларускага аддзялення павінны мець магчымасць вывучаць усе прадметы на беларускай мове. Вядома, у нас не хопіць пакуль выкладчыкаў, ды і не ўсе з ахвотай адгукнуцца на такое новаўвядзенне. Патрэбен час на перабудову, і не малы. З гэтай нагоды кіраўніцтву універсітэта неабходна зменшыць такім выкладчыкам агульную вучэбную нагрузку. Больш таго, трэба адкрыць трохмесячныя курсы навучання беларускай мове для тых выкладчыкаў, якія недасканала ёю валодаюць. А «беларускамоўным» студэнтам увесці ільготную стыпендыю. У нас жа звычайна за веданне мовы плоцяць.

Як бачна, без матэрыяльных сродкаў тут не абысціся, на беларусізацыю універсітэта неабходны грошы. Але наш флагман патрабуе таксама і структурных змен. Улічваючы вядучую ролю БДУ у сістэме народнай адукацыі БССР, мы хадайнічаем аб адкрыцці ў Белдзяржуніверсітэце факультэта беларускай філалогіі з аддзяленнямі: беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, а ў бліжэйшы час — славянскага і рамана-германскага аддзяленняў. Гэты факультэт — зусім не тое, што сённяшні філфак. Па сутнасці, цяпер беларускае аддзяленне непрэстыжнае, дробненая частачка філалагічнага факультэта, а павінен быць прафіліруючы культуралагічны факультэт, дзе рускае аддзяленне мела б іншыя задачы. Яно рыхтавала б выкладчыкаў рускай мовы для Беларусі, якія добра ведаюць беларускую мову.

Дарэчы, такі факультэт ёсць у Варшаўскім універсітэце, а ў нас, у Беларусі, на радзіме і зямлі беларусаў, яго няма. Адкрыць факультэт беларускай філалогіі — першасная задача, больш таго, універсітэт можа і павінен узяцца за арганізацыю міжнародных летніх курсаў па вывучэнню беларускай мовы, нашай культуры ў цэлым. Менавіта да нас, у Беларусь, павінны ехаць суайчыннікі з-за мяжы, якія займаюцца вывучэннем роднай мовы, цікавяцца яе лёсам, не забываюць яе і на чужыне, размаўляюць паміж сабой па-беларуску. Чым не прыклад для нашых сённяшніх сугрmaдзян-беларусаў, што адракліся матчынай мовы?

Асцярожна з мовай

В. Ф. ЦІКАВЫ, дэкан хімічнага факультэта.

Нягледзячы на тое, што лічу сваёй роднай мовай беларускую і дзяцей сваіх ад вывучэння яе не вызваляў, я, хімік, чытаю лекцыі на рускай мове. Прычына простая: родная мова не стала яшчэ ўнутранай неабходнасцю кожнага студэнта. Пакуль гэтага не будзе, ні аб якой беларусізацыі гаварыць нельга. Можна прыняць закон аб дзяржаўнасці беларускай мовы, выкладанні на ёй ва універсітэце, выдзяліць на гэтую справу грошы. Аднак гэта не эфектыўныя меры. Ёсць вялікая небяспека сустрэцца з моцнай глухой студэнцкай сцяной. У гэтай справе перш за ўсё — тактоўнасць, галоўнае не прымушаць студэнтаў вывучаць беларускую мову. Акрамя таго, я не ведаю ў нас на факультэце выкладчыка, які змог бы весці заняткі па хіміі па-беларуску.

Прэстыж — не прымус

Т. ЛОХАЧ, студэнт хімфака.

Не трэба баяцца надаць нашай мове статус дзяржаўнай. Мова афіцыйных зносін, дзяржаўная — гэта тая, на якой павінны весціся справаводства, афіцыйныя мерапрыемствы. Аднак ніхто нікога не прымушае дома размаўляць на гэтай мове. Што галоўнае для нашай мовы зараз? Прэстыж. А ён як раз і ствараецца дзяржаўным законам аб мове. Прэстыж — не прымус. Калі бацькі ведаюць, што іх дзеці пойдуць у Беларускі універсітэт, з беларускамоўным выкладаннем, яны не будуць вызваляць сваіх дзяцей ад вывучэння беларускай мовы ў школе. А магчыма, і запатрабуюць, каб навучанне ў школе вялося па-беларуску. Інакш дасканала мовай не авалодаць.

Студэнты адмовіліся

В. К. АХРАМЕНКА, дацэнт фізічнага факультэта.

Я распачаў чытаць лекцыі па матэматычнаму аналізу на беларускай мове. Зрэшты, мяне падтрымаў і В. А. Гайсёнак. Ён таксама выкладае фізіку па-беларуску. Але студэнты нас не падтрымалі, адмовіліся ад «супрацоўніцтва» на беларускай мове. Выказалі жаданне слухаць лекцыі па-руску, маўляў, па-беларуску не разумеем, мы паступалі на рускае аддзяленне. Вось чаму напачатку патрэбны два аддзяленні — беларускае і рускае, дзве плыні і, безумоўна, уступны экзамен па беларускай мове. Абавязкова на педагагічным патоку.

Неадкладна!

У. М. ЛАЗОЎСКІ, намеснік дэкана філфака.

Уступны экзамен па беларускай мове трэба пачынаць з наступнага года. Неадкладна! Не ўдасца іспыт, правесці хоць бы субяседаванне па беларускай філалогіі для ўсіх: і фізікаў, і лірыкаў. Ёсць цяжкасці з тэрміналогіяй, асабліва ў прыродазнаўчых навуках. Можа нам варта стварыць навуковую тэрміналагічную камісію? Вопыт узяць з далёкіх дваццатых гадоў, тады такая камісія існавала і правяла пэўную работу. Сілы для дзейнасці такой камісіі мы маем на філфаку. Але ж без удзелу ў гэтай справе спецыялістаў па той ці іншай дысцыпліне: хімікаў, фізікаў, філосафаў — не абысціся.

Разам з тым, трэба разгарнуць падрыхтоўку падручнікаў па беларускай мове для прыродазнаўчых факультэтаў. Прычым, падручнікаў новых, не калькіраваных з рускай мовы. Новых не толькі ў моўных адносінах, але і па іх структуры. Значна лепшых, цікавейшых, чым «рускі» аналаг.

Ліквідаваць «лікбез»!

У. А. СОСНА, дацэнт гістарычнага факультэта.

Гэта вельмі добра, што працэс беларусізацыі пачаўся. Аднак як ён ідзе? Гісторыя БССР чытаецца ва універсітэце 30 гадзін, а ў школе — 31. Пакуль студэнтам гэтага мізэру хапае. Для іх увогуле гісторыя БССР — навіна. У школе гэты прадмет вядзецца праз пень-калоду. Усё залежыць ад настаўніка, бо асобнага прадмета «Гісторыя БССР» няма, ёсць урокі ў складзе гісторыі СССР. Аднак што рабіць, калі школа перабудуецца? Тады сённяшні «лікбез» нам не спатрэбіцца. Можа ліквідаваць яго зараз? І даваць гісторыю Беларусі студэнтам у Беларускім універсітэце ў поўным аб'ёме.

За намі доўг

С. С. ШУШКЕВІЧ, народны дэпутат СССР, прарэктар па навуковай рабоце.

Мне здаецца, сёння не было гаворкі аб галоўным — аб адносінах беларускай інтэлігенцыі да роднай мовы, аб тым, як мы самі яе зневажаем. Мы самі не карыстаемся беларускай мовай, а хочам нейкім чынам адміністрацыйнымі метадамі заахвоціць некага гэту мову вывучаць. Мы, беларускія інтэлігенты, здрадзілі свайму народу, падманулі яго. Ён патраціў на нас сродкі, спадзяваўся, што мы яго падтрымаем, а мы не ў стане гэта зрабіць.

Нашы рэспубліканскія кіраўнікі не саромеюцца, калі ўсе гавораць па-беларуску, гаварыць па-руску. Гэта не стала для іх патрэбай. А самае галоўнае — гэта ўласны прыклад, прыклад інтэлігенцыі, прыклад кіраўніцтва рознага рангу. Таму я шчыра падтрымліваю зварот-прапанову да ўсіх грамадскіх арганізацый універсітэта і, у першую чаргу, да партыйнага камітэта перайсці ў сваёй рабоце на беларускую мову, каб паказаць прыклад уласнымі грамадзянскімі паводзінамі.

Першыя крокі — цяжкія

І. Г. ЧЫГРЫНАЎ, пісьменнік, старшыня камісіі Вярхоўнага Савета БССР па нацыянальных пытаннях і міжнацыянальных адносінах, старшыня Беларускага фонду культуры.

У нас высокаразвітая літаратура, няблага развіты тэатральнае і выяўленчае мастацтва, а мова знаходзіцца літаральна ў нулявым стане. З ужытку яна выйшла і вярнулася да дарэвалюцыйнай рысы свайго развіцця. Зрабіць першыя крокі да аднаўлення вельмі цяжка, без міні-праграм не абысціся. Вы правільна робіце, што пачынаеце са сваёй праграмы. Толькі такім чынам можна рушыць далей. Я бачу, што тут, ва універсітэце, ёсць сілы і розум, тут ведаюць, што рабіць для адраджэння беларускай мовы.

Матэрыялы «Адкрытай трыбуны» падрыхтаваў М. МАСТОЎСКІ.

КВЕТКІ Ў ВОКНАХ

Ад дотыку пяшчотных рук я цалкам падпарадкавалася яго волі.

— Расслабцеся! Не круціце галавой! — спакойна гучаў прыглушаны голас.— Скажыце а-а-а!

Лявонцій Хрыстафоравіч, прыдзірліва агледзеўшы мяне, канстатаваў: «У жанчыны ўсё павінна быць прыгожым. І знешнасць таксама. У вас тое-сёе патрабуе «ўдасканалення».

Прызнаюся, я не разлічвала трапіць на прыём да Лявонція Хрыстафоравіча Маца, але, пазнаёміўшыся з гэтым цудоўным чалавекам, не пашкадавала.

У прафілакторыі універсітэта, дзе кансультуе лор-урач Л. Х. Мац, мяне з гонарам запэўнілі, што тут усе такія чулыя і добрыя.

— У гэтым вы самі мелі магчымасць пераканацца,— сказаў у гутарцы са мной галоўны ўрач прафілакторыя М. Б. Канапелька.— Я задаволены і ўрачамі, і медсёстрамі, і паварамі, і прыбіральшчыцамі.

...Гэтыя два паверхі, дзе размешчаны прафілакторый, адразу вызначыш сярод астатніх. І не толькі па дыванах на падлозе. Яшчэ з вуліцы можна ўбачыць у вокнах кветкі. Пяшчотныя жаночыя рукі старанна даглядаюць іх. Пацікавілася: як часу хапае спраўляцца са сваімі абавязкамі і з кветкамі «вазіцца»? Жанчыны здзіўлена паглядзелі на мяне: «Няўжо ў вас дома няма кветак? (Спачатку я не зразумела пытання). Той, хто прыехаў да нас адпачываць і папраўляць сваё здароўе, павінен адчуваць сябе тут, як дома. Гэта ўжо палавіна поспеху».

Менавіта такой думкі і М. Б. Канапелька. Мы ідзём з Мікалаем Браніслававічам па яго «ўладаннях». Інгалятораторый, кабінеты парафіналячэння, падводнага масажу, лячэбных душаў, фізіятэрапеўтычных працэдур, ЛФК... Усюды чысціня, парадак, утульнасць. Адчуваецца нейкі асаблівы клопат, укладзены ў стварэнне гэтай сапраўды дамашняй абстаноўкі. Мне прыемна было знаёміцца з персаналам прафілакторыя. Я разумела: гэта дзякуючы іх намаганням у кнізе водгукаў — толькі добрыя словы. Дзякуюць за цеплыню і шчырасць, уважлівасць і клопат, за смачныя абеды і чысціню ў пакоях.

Спачатку здзіўлялася, чаму не падзяляе майго аптымізму М. Б. Канапелька. Але калі выслухала яго, зразумела: ён мае рацыю. Толькі адзін пералік таго, што патрабуе рамонту, мог бы скласці доўгі спіс. Не працуе вентыляцыя (яе, праўда, наладзілі, але пасля гэтага яна пачала круціцца ў адваротным напрамку), сапсавалася сістэма дымавывядзення, не пачынаецца рамонт падлогі, а форткі ў вокнах тут чакаюць ужо некалькі гадоў. Кіраўніцтва прафілакторыя і сёння не страчвае надзею, што калінебудзь кабінеты ўсё ж набудуць прывабны выгляд — іх абкладуць пліткай. А на кухні, нарэшце, будзе праведзена сігналізацыя, і загадчыца вытворчасцю зможа спаць спакойна (спробы крадзяжу ўжо здараліся).

Зразумела, усе гэтыя гаспадарчыя праблемы выбіваюць з каляіны, перашкаджаюць займацца іншымі справамі. Тым больш, што адміністрацыйна-гаспадарчая частка БДУ не вельмі спяшаецца выпраўляць недахопы і брацца за свае непасрэдныя абавязкі. Пакуль тут аддаюць перавагу простым абяцанкам. Напэўна, гэтак прасцей: ні ў чым жа не адмовілі, абяцалі дапамагчы. Мікалай Браніслававіч аптыміст. Ён верыць, што гаспадарчыя службы абавязкова павернуцца да іх тварам.



М. Б. Канапелька працуе ў прафілакторыі амаль з дня яго адкрыцця. Цікаўлюся: ці змянілася што з таго часу?

— Безумоўна,— з непадробленай радасцю гаворыць Мікалай Браніслававіч.— І галоўнае дасягненне — бясплатныя пуцёўкі на лячэнне, якія можа з бягучага навучальнага года атрымаць кожны, хто мае ў іх патрэбу. У гэтым — клопат пра людзей, пра іх здароўе, дабрабыт і плённую працу. Калі гаварыць канкрэтна пра нашу работу, то тут таксама шмат прыемных змен. Лепшай стала сістэма забеспячэння лякарствамі, медыцынскім абсталяваннем, прадуктамі харчавання. А тое, што нядаўна атрымалі 500 аднаразовых шпрыцоў — хіба дробязі? Сёння думаем аб тым, каб набыць камп'ютэр. Без яго, як без рук. Ён «памятаў» бы ўсе гісторыі хваробы, меню, розныя патрабаванні і пры неабходнасці мог бы хутка выдаваць патрэбную інфармацыю.

Доўга яшчэ Мікалай Браніслававіч дзяліўся сваімі планамі і задумкамі. У іх — рэальныя магчымасці і палёт фантазіі.

...Адчыняеш дзверы пакоя і нібы трапляеш у казачнае царства. Драўляныя разныя ложкі, узорчатыя карнізы. Колер сцен — цёплы, пяшчотны. Ручной работы пісьмовы столік, такія ж крэслы...

Вы, безумоўна, зразумелі, што гэта пакуль мары. Але дапамагчы М. Б. Канапельку ажыццявіць іх узяліся кааператары. Абяцаюць, што праз год усё гэта будзе наяве. Мікалай Браніслававіч вельмі спадзяецца на іх дапамогу.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

НА ЗДЫМКАХ:

* Трапіўшы на прыём да ўрача-стаматолага Л. С. Шымановіч, вы зменшыце свой боль — у гэтым вам дапаможа музыка.

* «Шлях да сэрца кожнага адпачываючага ляжыць цераз страўнік»,— упэўнены павары універсітэцкага прафілакторыя Л. С. Паўлава (справа) і С. А. Краўчук.

* У спартыўнай зале хопіць месца ўсім: і дарослым, і дзецям.

Фота С. ГРЫЦА.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

(Працяг. Пачатак у №№ 28, 29).

Галосная І ў канцы слоў



и ы

Галосная І — прамая рыска, пішацца знізу ўверх, ад асноўнай лініі да кантрольнай. Гэтым жа знакам абазначаецца і галосная Ы. Пры неабходнасці дакладна ўказаць галосную Ы, пад ёю ставіцца адметны знак (рысачка).

У канцы слоў галосная прыпісваецца да зычных:



л и ли сел сели пели дели мели кеды

Пра адметны штрых і тут нярэдка забываюць:



кеды пледы плесы псы следи следы

Нахіл галоснай І такі ж, як і пры напісанні злучальнай лініі. Як адрозніць галосную І ад злучальнай лініі?

Калі знак стаіць асобна (злучнік І) ці прыпісаны ў канцы слоў, то ўсё зразумела: гэта галосная І. Не станем жа мы выпісваць злучальную лінію, калі злучаць няма чаго. А пра тое, як галосная І пішацца ў сярэдзіне слова,— гаворка наперадзе.

Практыкаванне (не забывайце, што галосная І пішацца знізу ўверх):

Кеды и пледы. Лес и плес. Пекли кексы. Пели и плели. Следы кед. Сек лес. Дели кекс.

ТВМ



т в м

Кожны знак пішацца па цэлым радку.

Прабачце, а чым жа літара Т адрозніваецца ад І?

Гэта пытанне ў вас ужо напэўна, і зараз мы разгледзім шматлікія адрозненні названых літар:



т и

І. Т пішацца зверху ўніз, І — знізу ўверх. Таму літары маюць розны нахіл. Нахіл Т адпавядае нахілу іншых зычных знакаў, нахіл І адпавядае нахілу злучальнай рыскі.

2. Галосная І пры большым нахіле павінна ўсё ж такі дацягнуцца да кантрольнай лініі. Таму галосная атрымліваецца даўжэйшай.

3. Пры напісанні гэтых знакаў пяро робіць неаднолькавы націск. Т пішацца з націскам, І — без націска.

4. Там, дзе пяро адрываецца ад паперы, лінія становіцца танчэйшай. Знак Т танчэйшы ўнізе, І — уверсе.

Пры пісьме шарыкавымі ручкамі трэцяя і чацвёртая прыкметы не заўсёды заўважныя. Але першая і другая выражаны даволі акрэслена.



т кт пт ст лт дт тк тп тс тл тд



те тес тек текли телки тепле сетки

Пераходзім да літары В. Пішыце яе цэлы радок.

Пішыце не спяшаючыся, павольней, чым пішаце звычайныя літары. Аднак не ўпадайце ў другую крайнасць. Надзвычай павольнае пісьмо таксама скажае знакі. Літара В пры вельмі павольным пісьме атрымліваецца і крывой, і хвалямі. Але варта смялей правесці рыску — і яна распраміцца:



в кв пв св лв дв вк вс вл вд вт



вес весы вел вели весел веселы



м км пм см лм дм мк мп мс мд



мел мели кем тем плетем плетет

Займеннікі ТЫ, ВЫ, МЫ сустракаюцца вельмі часта, таму пра адметныя рысы ў гэтых словах мы «забываем». Словы і так лёгка чытаюцца.



ты ты вы мы Ты плети сети. Мы мели.

Практыкаванне:

Слеты дети плети плетет плетки слетел слетели клетки клев ветки вплели вплел сев лев веди метки метлы меди мети теми темы ведем теме смел смеси ведете клетке

Пели дети. В клетке лев. Следы вели в лес. В селе сев. Вы и мы. В селе слет. Вы ведете в лес. Вы веселы.

Знакі, якім не хапіла знакаў

Мы маем на ўвазе літары звычайнага алфавіту: мяккі знак і цвёрды знак. Вось ім і не хапіла стэнаграфічных знакаў. Абазначаюць іх кропкай, але што гэта за знак! А нічога іншага не знаходзіцца, усе знакі даўно падзелены паміж літарамі (мы яшчэ пабачым, каму і што дасталося).

Кропка ставіцца над літарай, за якой ідзе Ь ці Ъ:



сел сель вес весь мел мель сельдь

Успамінаюць пра кропку толькі ў выключных выпадках, калі баяцца, што без яе цяжка будзе прачытаць слова. У апошнім слове мы вырашылі абыйсціся без кропак. Здагадаемся. Ды і ў наступных словах можна пра яе «забыць»:



клеть плеть петь спеть сеть ведьмы

Практыкаванне: Мы плели сеть. Ведь в клетке лев. Весь век. Вы плетете сеть. Мед и медь. Мел и мель. В сети сельдь.

Вёў урок
Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвона» зорка» МВПА імя Я. Коласа.
23 лістапада
Зак. 1637.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.